# РЭФЕРАТ

**Бут-Гусаім Юлія Данатаўна**

**Модусы духоўнай арыентацыі герояў (на матэрыяле твораў Івана Шамякіна апошніх дзесяцігоддзяў)**

**Ключавыя словы:** модус, духоўна-маральная арыентацыя, проза, канфлікт, герой, тыпалогія вобразаў, аўтарская пазіцыя.

**Аб'ект даследавання** – празаічныя творы Івана Шамякіна (“Падзенне”, “Сатанінскі тур”, “Без пакаяння”, “Пошукі прытулку”, “Адна на падмостках”, “Paradies auf Erden”, “Палеская мадонна”, “Крывінка”, “Злая зорка”).

**Прадмет даследавання** – класіфікацыя модусаў духоўнай арыентацыі герояў у прозе Івана Шамякіна апошніх дзесяцігоддзяў.

**Мэта работы** – праз комплексны аналіз твораў Івана Шамякіна сучаснага перыяду выявіць разнастайнасць тыпаў герояў згодна з паняццем “модус” духоўнай арыентацыі.

**Металалагічную базу** дыпломнай работы складаюць напрацоўкі ў галіне гісторыі і тэорыі літаратуры, крытычныя і літаратуразнаўчыя артыкулы. Металогія даследавання грунтуецца на сістэмна-тыпалагічным, комплексным падыходзе да літаратурна-эстэтычных з'яваў, на дасягненнях кампаратывістыкі, герменеўтыкі, тыпалогіі, параўнальна-гістарычнага літаратуразнаўства.

**Навуковая навізна** атрыманых вынікаў заключаецца ў паглыбленні, удакладненні і вызначэнні тыпалогіі герояў празаічных твораў Івана Шамякіна апошніх дзесяцігоддзяў з дапамогай увядзення тэарэтычнага паняцця “модус”.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Вынікі дыпломнай работы могуць стаць падмуркам для далейшых даследаванняў у галіне тэорыі і гісторыі літаратуры, а таксама для вывучэння творчасці І.Шамякіна. Асобныя палажэнні і высновы дыпломнай работы могуць быць карыснымі для распрацоўкі ўрокаў літаратуры ў школах, практычных і семінарскіх заняткаў у вышэйшых навучальных установах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Scanned by CamScanner